# І ЧАРНОБЫЛЬСКАЯ ЗОНА

хараў з сусветным імем — можа, гэта не папулярызуе нацыянальную кухню, але яны вучаць нашых спецыялістаў свайму мастацтву, а госці бачаць нашы прадукты. Напрыклад, сёлета, калі кухары з сусветным імем наведалі «Савушкін прадукт», дык заявілі, што ў сваіх рэстаранах цяпер будуць карыстацца толькі гэтымі прадуктамі.

## Даходы ад турызму павялічацца

У сезон калядных і навагодніх свят паток турыстаў у Беларусі вырастае да летняга ўзроўню, пра гэта сведчыць вялікая загрузка гасцініц. Тлумачэнне тут простае:

— Беларусь зручнейшая за Еўропу, бо калі там сезон калядных кірмашоў заканчваецца адразу пасля Новага года, то ў нас толькі бліжэй да сярэдзіны студзеня. У беларускіх гарадах прыемна бавіць час, шпацыруючы па вуліцах, сёння ў кожным з іх ёсць свае «фішкі».

Карыстаюцца папулярнасцю і нашы гарналыжныя цэнтры: Раўбічы, Сілічы, Якуцкія горы. Турыстаў тут прыцягвае зручнае геаграфічнае размяшчэнне і фінансавая даступнасць.

Што датычыцца аздараўленчага турызму, то беларускія санаторыі ўжо даўно зарэкамендавалі сябе якаснымі і надзейнымі месцамі для адпачынку. Сёння ў большасці санаторыяў з'яўляюцца новыя віды паслуг, таму туды прыязджаюць цэлымі сем'ямі.

Павялічыць паток турыстаў дапамаглі прынятыя меры па спрашчэнні візавага рэжыму.

— З кожным годам колькасць турыстаў расце. З 10 лістапада ўвайшоў у сілу Указ № 300, які аб'ядноўвае бязвізавыя тэрыторыі ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях і дазваляе арганізаваным групам турыстаў наведваць усю тэрыторыю даных абласцей. Гэта дасць свой дадатковы эфект. Магчыма, колькасць турыстаў не павялічыцца, але колькасць дзён іх знаходжання ў Беларусі, несумненна, вырасце. А гэта павялічыць даходы ад турызму. Цяпер мы назіраем, як актыўна развіваюцца Брэсцкая і Гродзенская вобласці, там вырасла інфраструктура, павысілася якасць абслугоўвання. У кавярнях і рэстаранах ужо бачаць, якія турысты да іх прыязджаюць і на каго ім трэба арыентавацца. У параўнанні з іншымі абласцямі там выраслі інвестыцыі менавіта ў інфраструктуру, звязаную з турызмам.

Як і ў любой справе, якая развіваецца, у турызме нельга пазбегнуць праблемных пытанняў. Адно з іх сёння заключаецца ў кадрах.

— Спецыялістаў у сферы турызму рыхтуюць у 17 ВНУ краіны, гэта досыць шмат, яны выходзяць адтуль з добрай тэарэтычнай базай, аднак без практыкі. Тураператары скардзяцца, што часам учарашнія студэнты не ведаюць нават, як працаваць у сістэмах браніравання і адміністрацыі. Другое пытанне — веданне замежных моў, хацелася б, каб іх вучылі больш. Сёлета мы накіроўвалі групы з беларускіх гасцініц для павышэння кваліфікацыі ў турэцкія атэлі, налета таксама плануем гэта рабіць. Праводзім і шэраг іншых мерапрыемстваў для павышэння якасці абслугоўвання, запрашаем міжнародных спікераў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### Заканатворчасць

## Навацыі ў турындустрыі

**Праект абноўленага закона «Аб турызме» плануецца ўнесці на разгляд у парламент у 2020 годзе. Пра гэта паведаміў журналістам намеснік дырэктара — начальнік аддзела планавання і арганізацыі турысцкай дзейнасці дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Беларусі Віталь ГРЫЦЭВІЧ у прэс-цэнтры БелТА.**

«У адпаведнасці з устаноўленымі тэрмінамі восенню мы ўнеслі дакумент у Савет Міністраў. Мы дапрацоўвалі яго з Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававых даследаванняў. Наступны крок — урад павінен унесці яго ў парламент, гэта наступны год», — сказаў Віталь Грыцэвіч.

Паводле яго слоў, змены, якія ўносіліся падчас дапрацоўкі, не носяць прынцыповага характару. «Асноўныя пасылы — стварэнне фінансавых гарантый для беларускіх турыстаў, дакладны падзел зон адказнасці тураператараў і турагентаў, больш дакладнае рэгуляванне экскурсійнай дзейнасці. Яны ўсе захаваліся», — дадаў ён.

Пры гэтым Віталь Грыцэвіч звярнуў увагу, што не варта чакаць уваходу ў сілу новага закона «Аб турызме» ўжо ў 2020 годзе. Гэта звязана з тым, што трэба падрыхтаваць падзаконныя прававыя дакументы.

# ПА РАЦЭ

Беларусі для большасці гасцей выключае неабходнасць акліматызацыі, што, у сваю чаргу, спрыяе хутчэйшай рэабілітацыі пацыентаў.

Арганізацыяй медыцынскіх тураў займаюцца мэтанакіравана. Тураператары улічваюць усе аспекты паездкі. Яны рыхтуюць поўны пакет дакументаў, ажыццяўляюць падбор медыцынскай або аздараўленчай установы, пры неабходнасці забяспечваюць суправаджэнне пацыента. У Віцебскай вобласці першапраходцам у аказанні паслуг па медыцынскім турызме стала клініка Віцебскага дзяржаўнага Ордэна Дружбы народаў медыцынскага ўніверсітэта.

Прыдзвінскі край вядомы як фестывальны, і тут вельмі развіты так званы падзейны турызм. Летась толькі дзяржаўнымі ўстановамі культуры вобласці праведзена больш за 120 фэстаў! Сярод іх — каля дзесяці міжнародных фестываляў і свят, што фінансуюцца з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў. Для ўдзелу ў іх з кожным годам прыязджае ўсё больш замежных гасцей.

Канешне, самы вядомы міжнародны фэст мастацтваў — «Славянскі базар у Віцебску». Але ёсць нямала іншых, якія штогод прымаюць усё больш удзельнікаў. Можна згадаць міжнароднае свята «Браслаўскія зарніцы», міжнародны спартыўна-музычны фестываль «Viva Braslav» — у Браслаўскім раёне, Міжнародны фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» — у Пастаўскім, «Вішнёвы фестываль» — у Глыбоцкім, Міжнародны фестываль беларускай міфалогіі «У госці да Лепельскага Цмока» — у Лепельскім, экалагічнае свята «Жураўлі і журавіны» — у Мёрскім...

Велізарнай папулярнасцю карыстаюцца міжнародны фестываль дзіцячай і маладзёжнай творчасці «Вясёлка над Віцебскам», пленэр «Віцебск — горад Марка Шагала», «Калядны харавы фестываль».

Вынікам работы па папулярызацыі турыстычнага патэнцыялу з'яўляецца прыцягненне ў Віцебск арганізатараў маштабных фестываляў дзіцячай і маладзёжнай творчасці. Так, з 2014 года пастаянную прапіску атрымалі фестывалі «Салют талентаў», «Феерверк талентаў», «Планета Беларусь», арганізатарамі якіх з'яўляюцца буйныя фестывальныя камітэты з Масквы і Санкт-Пецярбурга. Удзельнікі гэтых мерапрыемстваў — дзеці і моладзь з розных рэгіёнаў Расіі і Беларусі.

У вобласці на працягу апошніх гадоў назіраецца станоўчая дынаміка ў экспарце турыстычных паслуг, вартасны аб'ём якіх за 2018 год узрос у 1,5 раза ў параўнанні з 2015-м.

Ды што і казаць — турызмам у правінцыі займацца выгадна, бо ёсць нямала прэферэнцый. А для вяскоўцаў наогул, калі прымаюць турыстаў у аграсядзібах, прадугледжаны сімвалічны падатак — базавая велічыня ў год.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

«МС» СПЫТАЛА

# НОВЫ ІМПУЛЬС «БЯЗВІЗУ»

## Бязвізавая зона пашыраецца, але ёсць праблемы

**За тры гады існавання бязвізавага рэжыму Гродна наведала 300 тысяч турыстаў — амаль столькі, колькі жыве ў горадзе. У хуткім часе прагназуецца рост колькасці наведвальнікаў, бо з 10 лістапада пачаў дзейнічаць Указ № 300, які значна пашырае бязвізавыя межы: цяпер у гэтай зоне сем раёнаў вобласці. Але ці паспявае рэгіён за патокам турыстаў? Мы выслухалі меркаванні прадстаўнікоў турыстычнай сферы і ўлады.**

**Яўген АРАДЗЬ, начальнік аддзела спорту і турызму Гродзенскага гарвыканкама:**

— Горад развівае гэты кірунак, палепшыліся ўзровень і якасць абслугоўвання, у першую чаргу гасцінічная інфраструктура. Налета ў горадзе з'явіцца яшчэ сем хостэлаў, 20 кавярняў і рэстаранаў. Асобная ўвага ўдзяляецца кадрам. Цяпер абавязковае патрабаванне да іх — валоданне замежнай мовай. Падрыхтоўку вядзе наш універсітэт імя Я. Купалы. Іх размеркаванне пад кантролем абласной выканаўчай улады.

Разам з тым ёсць праблемы ў развіцці вытворчага турызму. Пакуль не ўсе кіраўнікі прадпрыемстваў выказваюць разуменне такога кірунку. Сярод самых актыўных можна назваць «Малочны мір», дзе штодня бывае да 120 турыстаў.

**Міхась НАРЫНКЕВІЧ, экскурсавод:**

— Зараз прыток турыстаў у Гродне проста зашкальвае. Прыязджаюць вельмі вялікія групы з Літвы і Польшчы. Ёсць нямала турыстаў з іншых краін, і гэта вельмі прыемна. Калі казаць пра іх густы, літоўцы і палякі любяць наведваць храмы, касцёлы, аб'екты, якія датычацца агульнай гісторыі. Пашырэнне бязвізавай зоны дасць магчымасць павялічыць прыток турыстаў з Брэсцкай вобласці, дзе таксама ёсць граніца з Польшчай.

**Мікалай БРАТАНЮК, кіраўнік буйной турыстычнай фірмы:**

— Ёсць некаторыя лакальныя праблемы, напрыклад недахоп экскурсаводаў, якія валодаюць замежнымі мовамі. Таксама турфірмы ўзнімаюць пытанне электроннай рэгістрацыі на граніцы. У Брэсце такая тэхналогія ўжо апрабавана. Чым гэта зручна? Не трэба стаяць у чэргах, турыст прыязджае ў свой час, на табло загараецца нумар яго аўтамабіля, і ён спакойна праязджае. У нас пакуль такога няма. Яшчэ адна праблема — недахоп месцаў у гасцініцах. Вельмі станоўчым фактарам у прыцягванні турыстаў будзе магчымасць знаходзіцца без рэгістрацыі да 10 дзён. Раней можна было толькі да пяці дзён. Дакумент аб павялічэнні тэрміну знаходжання без рэгістрацыі па месцы часовага прабывання падпісаны нядаўна кіраўніком дзяржавы. Гэта чарговае зніжэнне бар'ераў для бязвізавых турыстаў. Асабліва для тых, хто вандруе не з групай, а самастойна. Звычайна такім турыстам няручна займацца адміністрацыйнымі працэдурамі ў адрозненне ад групавых тураў, калі гэтыя праблемы вырашае турфірма.

### У тэму



grodnonews.by

Нядаўна Гродна першае ў краіне атрымала турыстычны лагатып і слоган. Яго аўтары — дызайнеры брэнд-студыі з Брэста. Яны прапанавалі стылізаваную выяву алення святога Губерта з герба горада са слоганам «Легенды нараджаюцца тут». Тое, як выкарыстоўваць новую «фішку», будуць абмяркоўваць падчас пасяджэння гарадскога каардынацыйнага савета па развіцці турызму ў пачатку 2020 года.

**Ала НАВАЦКАЯ, галоўны ўрач санаторыя «Жамчужына»:**

— Санаторый знаходзіцца ў гарадской зоне і актыўна працуе з бязвізавымі турыстамі. Сёння гэта ўся Прыбалтыка, Польшча. Калі тры гады таму былі адзінкавыя выпадкі, то цяпер пачаўся рост. Мы асабліва задаволены, што для санаторыяў павялічыўся тэрмін знаходжання — з 10 да 15 дзён. За гэты перыяд можна атрымаць паўнавартасны аб'ём санаторна-курортнага лячэння. Медыцынскім турызмам зацікаўлены ў многіх краінах, і мы можам прапанаваць адпаведную базу. У нас заключаны дагаворы з усімі клінікамі горада, таму наведвальнікі могуць атрымаць шырокае кола паслуг. Апошнім часам павялічваецца колькасць грамадзян Польшчы. Там санаторна-курортнае аздараўленне праходзіць крыху інакш, але, калі яны прыязджаюць, то прыемна здзіўлены і ўзроўнем паслуг, і абслугоўваннем.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**